of access: 17.04.2014.
16. Q&A: Reality of Iran in relation to US Policy 21 August 2013 // Hizb ut-Tahrir America website [Electronic Resource]. – Mode of access: – http://hizb-america.org/index.php/culture/politics/221-q-a-reality-of-iran-in-relation-to-us-policy – Date of access: 17.04.2014.
17. *Schmidt, G.* Islam in Urban America: Sunni Muslims in Chicago / G. Schmidt. – Philadelphia: Temple UP. 2004. – 244 pp.
18. *Spencer, R.* Arab winter comes to America / R. Spencer. – Wash.: Regnery Publishing, 2014. – 280 p.
19. *Swick, S.* From London to Andijan: The rising global influence of Hizb-ut-Tahrir among Muslim Youth [Electronic Resource] / S. Swick // Minaret of Freedom Institute. – 16 p. – Mode of access: – http://www.minaret.org/hisb%20at-tahrir.pdf. – Date of access: 18.02.2019.

**(Дата подачи 28.02.2019 г.)**

*А. М. Кротаў*
Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Ф. Скарыны, Гомель
*A. M. Krotau*
Francisk Skorina Gomel State University, Gomel

**УДК 94(476):316.647.8=162.1"16/19"**

## ПРАЯВЫ ЭТНА-ПСІХАЛАГІЧНЫХ АСАБЛІВАСЦЯЎ БЕЛАРУСАЎ ВА ЎСПРЫМАННІ ІМІ І АЦЭНЦЫ ПАЛЯКАЎ У ПЕРЫЯД НОВАГА ЧАСУ

## MANIFESTATIONS OF ETHNO-PSYCHOLOGICAL PECULIARITIES OF BELARUSIANS IN THEIR PERCEPTION AND EVALUATION OF POLES IN THE PERIOD OF NEW TIME

*У артыкуле разглядаюцца праявы этнапсіхалагічных асаблівасцяў беларусаў ва ўспрыманні імі і ацэнцы палякаў у перыяд новага часу. Робіцца выснова, што ў разглядаемы перыяд беларусы жылі ва ўмовах, якія не спрыялі развіццю іх нацыянальнай самасвядомасці і загартоўцы нацыянальнага характару, але садзейнічалі фарміраванню своеасаблівага комплексу этнічнай непаўнацэннасці. У рамках намаганняў, накіраваных на яго пераадоленне, прадстаўнікі новай беларускай інтэлігенцыі зрабілі шмат для выкаранення ў масавай свядомасці беларусаў перакананне аб культурнай перавазе палякаў і пагоршання стаўлення да іх, што найшло сваё адлюстраванне ў негатыўным стэрэатыпе паляка.*

*Ключавыя словы: беларусы; этна-псіхалагічныя асаблівасці; імагалогія; міжнацыянальныя адносіны; беларускі стэрэатып паляка.*

*The article deals with the manifestations of ethno-psychological peculiarities of Belarusians in their perception and evaluation of Poles in the period of new time. It is concluded that in the period under review Belarusians lived in conditions that did not contribute to the development of their national identity and hardening of national character, but contributed to the formation of a kind of complex ethnic inferiority. As part of the efforts to overcome it, representatives of the new Belarusian intelligentsia have done much to eradicate in the mass consciousness of Belarusians*

*the persuasion about the cultural superiority of the Poles and the deterioration of attitudes towards them, which is reflected in the negative stereotype of the Pole.*

*Key words: belarusians; ethno-psychological characteristics; imagology; interethnic relations; the belarusians stereotype of the Pole.*

Пачынаючы размову аб праявах этна-псіхалагічных асаблівасцяў беларусаў ва ўспрыманні імі і ацэнцы палякаў у перыяд новага часу, неабходна ўдакладніць адразу ж, што прадмет даследавання знаходзіцца ў поле цікавасці такой новай галіны навуковых ведаў, як гістарычная імагалогія, і зрабіць кароткі агляд базавых тэрмінаў, якімі яна аперуе.

У працэсе апісання нацыянальных рыс, спецыфікі ладу жыцця беларусаў, манеры іх паводзін, роўна як і пры апісанні прадстаўнікоў любога іншага народа, абавязкова заходзіць гаворка і аб іх нацыянальным характары. Адзін з заснавальнікаў расійскай школы палітычнай псіхалогіі, Д. В. Альшанскі ў сваёй кнізе «Асновы палітычнай псіхалогіі» даў наступнае вызначэнне нацыянальнага характару: «Нацыянальны характар – гэта сукупнасць найбольш ўстойлівых, характэрных для дадзенай нацыянальнай супольнасці асаблівасцяў ўспрымання навакольнага свету і формаў рэакцый на яго. Нацыянальны характар ўяўляе сабой, перш за ўсё, пэўную сукупнасць эмацыянальна-пачуццёвых праяў, выяўляючыся ў першую чаргу ў эмоцыях, пачуццях і настроях – у падсвядомых, шмат у чым ірацыянальных спосабах эмацыйна-пачуццёвага асваення свету, а таксама ў хуткасці і інтэнсіўнасці рэакцый на падзеі, што адбываюцца» [1, с. 294–295].

Як бачым з гэтага вызначэння, ледзь ці не самым важным складнікам нацыянальнага характару з'яўляюцца «асаблівасці ўспрымання навакольнага свету і формы рэакцый на яго». Успрыманне ж навакольнага свету часцей за ўсё даследчыкі атаясамліваюць з нацыянальным менталітэтам.

Дарэчы, тэрмін «менталітэт» упершыню стаў выкарыстоўвацца ў гістарычнай навуцы, а дакладней – у этналогіі. Адсюль яго запазычылі псіхолагі і сацыёлагі. Даволі хутка ён перакачаваў з навуковага асяроддзя ў публіцыстыку, дзякуючы якой стаў агульнаўжывальным. Шмат у чым цяперашняя папулярнасць дадзенага тэрміна вызначае існаванне розных азначэнняў паняцця «менталітэт», часцей за ўсё звязаных з канкрэтнымі відамі менталітэту, у тым ліку і менталітэтам нацыянальным.

Нацыянальны менталітэт – гэта ўласцівы народу (нацыі) стыль жыцця, культуры, а таксама ўласцівая яму (ёй) сістэма каштоўнасцяў, поглядаў (у тым ліку і погляду на свет), рыс характару, норм паводзін. Даследчыкі рознай навуковай спецыялізацыі стасуюцца ў меркаванні, што нацыянальны менталітэт характарызуецца ўстойлівай нязменнасцю, кансерватызмам, слабой схільнасцю да ўздзеянняў звонку, спробам ідэалагічнага і ўсякага іншага ціску.

Нацыянальны менталітэт цесна звязаны з фарміраваннем нацыянальнай самасвядомасці. Наогул, калі размова ідзе аб нацыянальным менталітэце, звычайна вядуць гаворку аб фарміраванні нацыі. Фармуючыся

і аб'ядноўваючыся ў нацыі, кожны народ выпрацоўвае свой менталітэт, сваю нацыянальную самасвядомасць [2, с. 180]. Апошняя ўяўляе сабой шматпланавую з’яву. Гэта і сацыяльная памяць народа аб яго мінулым, і ўяўленне пра яго жыццё сёння, і ўсведамленне перспектыў будучага развіцця. Нацыянальная свядомасць уключае ў сябе таксама разуменне месца, ролі народа, як мінімум, – у развіцці рэгіёну і канкрэтнай цывілізацыі, як максімум – чалавецтва наогул.

Разглядаючы нацыянальную самасвядомасць як адзін з элементаў грамадскай свядомасці, неабходна памятаць, што структура апошняй вельмі складаная. Але, перш за ўсё, у ёй вылучаюць штодзённа-практычны і навукова-тэарэтычны ўзроўні. Таму і ў нацыянальнай самасвядомасці таксама вылучаюцца звычайны і тэарэтычны ўзроўні. На штодзённым узроўні нацыянальная самасвядомасць менш структураваная і больш павярхоўная, чым на тэарэтычным, затое яна мае «на ўзбраенні” эмацыйна афарбаваныя ўстаноўкі і нацыянальныя стэрэатыпы – заўсёды пазітыўны аўтастэрэатып і заснаваныя на прадузятасцях стэрэатыпы «чужых». Стэрэатыпы з'яўляюцца слаба рухомымі кампанентамі, якія забяспечваюць стабільнасць і інэрцыйнасць звычайнай нацыянальнай свядомасці. Найбольш рухомымі ж яе элементамі з’яўляюцца патрэбы. У нашым выпадку, калі ідзе гаворка пра ўспрыманне беларусамі палякаў у перыяд новага часу, можна весці размову толькі пра тое, што магло існаваць на штодзённым узроўні іх нацыянальнай свядомасці. Што датычыцца тэарэтычнага яе узроўню, то тут справа знаходзіцца ў больш складаным стане, паколькі гэты ўзровень утрымлівае, перш за ўсё, ідэалогію нацыі і нацыянальную ідэю. Аднак у перыяд новага часу беларусы не мелі ні першага, ні другога.

Лічыцца, што беларусы ўвогуле маюць невысокі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці. Гэты пункт гледжання заснаваны, перш за ўсё, на тым, што яны часцей за ўсё па жыцці праяўляюць, магчыма, нават залішнюю разважлівасць, кіруючыся «здаровым сэнсам», а не тымі пачуццямі, якія генеруе іх нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная псіхіка і г. д. Беларусы як індывіды эмацыйна адчужана суперажываюць уласнае адзінства з іншымі прадстаўнікамі беларускай супольнасці. Адным з пацверджанняў слабога развіцця ў іх нацыянальнай ідэнтычнасці з’яўляецца той факт, што нідзе за межамі Беларусі, у адрозненне, напрыклад, ад украінцаў, яны не ўтвараюць арганізаваных дыяспар. Да таго ж наўрад ці можна прыпісаць беларусам нейкія яскравыя, выключныя рысы, якія адразу кідаюцца ў «чужыя» вочы і якія надаюць іх нацыянальнаму абліччу непаўторную ўнікальнасць.

Тым не менш, беларусы ўсё ж маюць сваё нацыянальнае аблічча, якім яны адрозніваюцца ад украінцаў, рускіх, палякаў, не кажучы ўжо аб іншых. Яны маюць свой нацыянальны характар і ўнікальны менталітэт, якія фармаваліся ў вельмі няпростых гістарычных умовах пад уздзеяннем шматлікіх фактараў. Адным з іх было працяглае дамінаванне на беларускіх землях польскага нацыянальнага элемента. У ходзе сваёй інфільтрацыі ў бе-

ларускае этнічнае асяроддзе палякі сталі ў вачах яго прадстаўнікоў аб'ектам вывучэння і ацэнкі. Наўрад ці ёсць падставы ставіць пад сумненне факт існавання ў перыяд новага часу беларускага стэрэатыпа паляка. Але яго навуковая рэканструкцыя з'яўляецца вельмі няпростай справай, паколькі існуе сур'ёзны дэфіцыт гістарычных крыніц, на базе якіх было б магчымым яе правядзенне.

Наратыўныя крыніцы, якія з'яўляюцца галоўнай асновай любога гістарычнага даследавання (за выключэннем даследаванняў, якія праводзяцца ў рамках спецыяльных і дапаможных гістарычных дысцыплін, або гісторыі першабытнага грамадства), у вывучэнні дадзенага стэрэатыпа аказваюцца малакарыснымі. Людзі, якія іх складалі, ва ўмовах панавання шляхецкай ідэалогіі наўрад ці адчувалі сябе беларусамі, нават калі былі такімі па сваім паходжанні. Яны кіраваліся шляхецкай салідарнасцю, у аснове якой ляжала, што б мы ні гаварылі сёння аб інтэрнацыянальнай якасці польска-літоўскай шляхты, польскую нацыянальную самасвядомасць. Стэрэатып, які сябе праяўляе ў наратыўных крыніцах, з'яўляецца хутчэй аўтастэрэатыпам паляка, чым яго беларускім стэрэатыпам.

Значная частка прадстаўнікоў беларускай сацыяльнай эліты, якая падверглася польскаму асімілятарскаму ўздзеянню, выяўляла салідарнасць з каталіцкай царквой, польскім народам і яго культурай. Засваенне польскай мовы, польскай шляхецкай культуры стала модай. Аднак гэта не выключала выкарыстання ў зносінах з простымі людзьмі і ў сваім побыце мясцовых дыялектаў. Напрыклад, Януш І Радзівіл у 1615 г. у лісце да свайго брата, польнага гетмана Літоўскага Крыштофа Радзівіла, пісаў: «І хоць я сам літвінам нарадзіўся і літвінам памру, аднак ідыёму польскую выкарыстоўваць у айчыне нашай вымушаны» [3, с. 15].

Услед за шляхтай у працэс паланізацыі былі ўцягнутыя ўсе тыя, хто спрабаваў падняцца па службовай лесвіцы, дасягнуць поспеху у жыцці – духавенства, мяшчане. Узбагачаючы сваімі намаганнямі і без таго больш развітую, і ў гэтым сэнсе слова больш высокую польскую культуру, яны адрываліся ад культуры мясцовай, беларускай, якая з часам стала ўспрымацца як сялянская, «хлопская» або «хамская». І калі ў пачатку XVII ст. некаторыя прадстаўнікі беларускай традыцыі, прыхільнікі старасвецкага ладу жыцця, асуджалі нацыянальнае рэнегацтва, зло высмейваючы яго [4], то ў наступны перыяд падобныя пратэсты супраць паланізацыі ўжо не раздаваліся. Наўрад ці можна сцвярджаць, што гэтыя людзі адчувалі сябе беларусамі, але, без усякага сумнення, іх нельга лічыць палякамі, бо яны дэманстравалі поўную адсутнасць у іх польскай нацыянальнай самасвядомасці.

Сыход беларускай эліты ва ўлонне польскай культуры, самаўхіленне яе ад нацыянальнага культурнага жыцця, вельмі адмоўна адбіліся на яго развіцці. У тым ліку затармазіўся і працэс стварэння беларускіх нацыянальных стэрэатыпаў, якія і без таго ішоў запаволенымі тэмпамі. Аднак тое, што развіццё беларускага стэрэатыпа паляка перастала цікавіць прадстаўнікоў

паланізаванай беларускай эліты, не азначала поўнага яго спынення. У беларускім прастанародным асяроддзі працягваў існаваць і нават павольна развівацца негатыўны стэрэатып, які стаў ужо часткай светаўспрымання яго прадстаўнікоў. Сам факт прысутнасці на беларускіх землях палякаў не дазваляў яму страціць актуальнасць і знікнуць. Але аб'ектам стэрэатыпізацыі і вобразатворчасці былі не толькі палякі, і нават галоўным чынам не этнічныя палякі, а беларускія рэнегаты, якія добраахвотна абралі моўную і культурную паланізацыю. Помнікі беларускага фальклору ўтрымліваюць даволі шмат сатырычных персанажаў, якія паказваюць такіх «паноў».

Аднак вывучэнне гэтых помнікаў таксама не дазваляе гаварыць аб існаванні поўнасцю аформленага стэрэатыпа паляка. Больш за тое, як гэта ні дзіўна (маючы на ўвазе тую акалічнасць, што пазітыўных нацыянальных стэрэатыпаў наогул не існуе), асартымент характарыстык, якія прыпісваюцца паляку і якія сталі стэрэатыпнымі, дазваляе гаварыць пра тое, што ў беларусаў нейкіх непрыязных пачуццяў або прадузятасці ў дачыненні да палякаў не было. Беларуска-польскія міжнацыянальныя адносіны не насілі канфліктнага характару, а таму і не было той псіхалагічнай базы, на якой негатыўны стэрэатып паляка мог бы развівацца. Аднак і пазітыўнымі згаданыя вышэй характарыстыкі назваць таксама нельга. Стаўленне беларусаў да палякаў, па меншай меры, – да падзелаў Рэчы Паспалітай і ўваходжання беларускіх зямель у склад Расійскай імперыі, можа вызначацца як індыферэнтнае з налётам іроніі і лёгкага сарказму.

Гібель Рэчы Паспалітай не з'явілася для беларусаў прадметам смутку і тэмай для балючых перажыванняў. Адбілася традыцыя, якая культывавалася ў свой час самімі ж палякамі. Пытанні палітыкі былі прадметам клопату прадстаўнікоў палітычнага народа-шляхты і не павінны былі цікавіць "хлопаў". Яны імі і не цікавіліся. Без удзелу, хоць і з увагай, глядзелі з боку на тое, як разбураецца стары ўклад жыцця, як многія з ранейшых яго гаспадароў, шляхціцаў, дэградавалі, апускаліся на сацыяльнае дно, асабліва ў выніку перагляду расійскімі ўладамі статусу шляхты ў 1831–1834 гг. «Але як ён ні круціўся, – распавядае пра галоўнага свайго героя Пятроўскага казка "Дваранін" (са збору А. К. Сержпутоўскага) – так-такі да ліха дажыўся, як тыя палякі, што ні хлеба, ні табакі» [5].

Прадстаўленая ў п'есе родапачынальніка беларускай літаратуры В. Дуніна-Марцінкевіча [6] шляхта не выклікала да сябе шчырай спагады чытача. Яе матэрыяльная галеча ўспрымалася ім як цалкам адэкватная і, галоўнае, заслужаная адплата за духоўнае ўбоства, цемру, глупства, задзірыстасць і фанабэрыстасць. У той час, як у самой Польшчы развівалася і ўваходзіла ў моду канцэпцыя польскага месіянства (адным з яе заснавальнікаў быў сам А. Міцкевіч – *А. К.*), якая засноўваецца на тым, што «польскасць» была ўзнёслай, вядучай ідэяй чалавецтва, канчатковым этапам яго эвалюцыі, стаўленне В. Дуніна-Марцінкевіча да шляхты – яе натуральнага носьбіта – было падобным на здзек. В. Дунін-Марцінкевіч

ўнёс сур'ёзны ўклад у генезіс беларускага стэрэатыпа паляка, улавіўшы алгарытм стыхійнага фарміравання гэтага стэрэатыпа ў масавай свядомасці беларусаў і прадставіўшы ў «Пінскай шляхце» карыкатурны вобраз шляхціца – носьбіта стэрэатыпных рыс, якія прыпісваюцца паляку.

Тым не менш, ні ў канцы XVIII, ні ў першай трэці XIX ст., на беларускіх землях палякі не сталі аб'ектам, які выклікаў у адносінах да сябе непрыязнасць і агрэсію з боку беларусаў, а таксама адпаведныя гэтым псіхалагічным рэакцыям вобраза- і стэрэатыпатворчыя намаганні.

Аднак пасля польскага нацыянальна-вызваленчага паўстання 1830–1831 гг. сітуацыя змянілася. Расійскія ўлады пачалі палітыку паслаблення польска-каталіцкага ўплыву на беларускае насельніцтва. У выніку Полацкага сабора, які адбыўся ў лютым 1839 г., уніяцкая царква ў заходніх губернях прымусова распускалася і мясцовыя ўніяцкія суполкі перайшлі ў праваслаўе. Да Расійскай праваслаўнай царквы далучылася звыш 1600 прыходаў, якія налічвалі больш за 1,6 млн вернікаў. У праваслаўную царкву перайшло больш за 1500 святароў. Уз'яднанне ўніятаў з праваслаўем, праведзенае «зверху», не сустрэла супраціўлення простага народа [7].

Акрамя таго, быў закрыты Віленскі ўніверсітэт, які лічыўся рассаднікам паланізма. У 1829 г. была створана Беларуская навучальная акруга, якая ўпершыню акрэсліла беларускую этнічную мяжу. У яе склад уваходзілі Віцебская, Магілёўская, Мінская, Віленская, Гродзенская губерні і Беластоцкая вобласць. Антыпольская палітыка царызму ўзмацнілася яшчэ больш пасля польскага нацыянальна-вызваленчага паўстання 1863–1864 гг. Расійская прапаганда заўзята ўзялася за выкараненне польскіх уплываў у Паўночна-Заходнім краі і зрабіла шмат для абуджэння ў асяроддзі беларусаў этнічнай самасвядомасці. Зразумела, рускія рабілі гэта не дзеля саміх беларусаў, а ў рамках супрацьдзеяння польскім уплывам. Наколькі паспяховым аказалася гэта ідэалагічнае супрацьдзеянне, паказала паўстанне 1863–1864 гг., падчас якога беларускае сялянства не толькі не падтрымала паўстанцаў, але і аказала садзейнічанне расійскім уладам у пераследаванні польскіх інсургентаў [8].

Такім чынам, у палітычных рэаліях XIX ст., намаганнямі царызму беларусы пазбавіліся ад польскай перавагі. Больш таго, у 60–70-х гг. XIX ст. расійскія навукоўцы ў рамках «тэорыі заходнерусізму» прадпрымалі спробы даказаць, што беларусы з'яўляюцца самабытным адгалінаваннем рускага этнасу, а іх этнаграфічныя адрозненні разглядаліся імі як вынік польскіх уплываў, якія падлягалі выкараненню. Пачалося інтэнсіўнае вывучэнне беларускай народнай культуры. Улады дазволілі друкаваць на беларускай мове «грамадзянкай» этнаграфічныя зборнікі. Ва ўрадавых статыстыках і картах пачалося выкарыстанне тэрмінаў «Беларусь» і «беларусы». Аднак, насуперак чаканням расійскіх паліттэхнолагаў і навукоўцаў, шматлікія навуковыя даследаванні, якія павінны былі паслужыць умацаванню заходнерусізму, паспрыялі афармленню ўласна беларускай культурнай традыцыі. У этнічнай

самасвядомасці беларусаў, якая да таго знаходзілася ў зачаткавым стане і выяўляла сябе толькі ў проціпастаўленні з прадстаўнікамі іншых этнічных груп, што выказвалі ў дачыненні да беларусаў адчужанасць, адбыўся прарыў. Беларусы, якія раней не мелі ўласнага этнічнага аўтастэрэатыпа – сфармаванага і ідэалагічна абгрунтаванага погляду на саміх сябе – і адчувалі, як сцвярджае Ю. Чарняўская, вядучы размову пра сялян, якія складалі сярод беларусаў пераважную большасць, свайго роду комплекс «этнічнай непаўнацэннасці» [9, с. 62], перасталі сябе саромецца, прасвятлелі.

Цікавасць да беларусаў, праяўленая палякамі і рускімі ў рамках ідэалагічнага супрацьстаяння паміж сабой, без усялякага сумнення, адыграла станоўчую ролю ў справе канструявання беларускай этнічнасці, за якую свядома ўзялася нованароджаная беларуская інтэлігенцыя. Яна не толькі адкрыта заявіла аб праве беларускага народа на сваю ўласную культуру, але і зрабіла шмат для таго, каб ператварыць «тутэйшага» ў «беларуса» – чалавека, які ўмеў складаць сваё ўяўленне аб знешнім свеце і аб своеасаблівасці ўласнай супольнасці. Хоць Ф. Багушэвіч і Я. Купала пачыналі пісаць па-польску, а Я. Колас і М. Багдановіч – па-руску, усе яны свядома, наўмысна прыйшлі да творчасці на беларускай мове і дапамаглі гэтую метамарфозу ажыццявіць.

Надаць друзлай этнічнай самасвядомасці беларусаў новую якасць і вывесці іх са здранцвення ў спецыфічных умовах другой паловы XIX – пачатку XX ст. было вельмі складана. Але агульная сітуацыя, якая склалася ў еўрапейскай культурнай і грамадска-палітычнай думцы таго часу, гэтаму спрыяла – актывізаваўся працэс абуджэння нацыянальнай самасвядомасці непалітычных народаў Еўропы, у тым ліку і беларускага.

Лічыцца, што ў структуру нацыянальнай ідэнтычнасці як складніка нацыянальнай самасвядомасці ўваходзяць тры кампаненты: 1) кагнітыўны – веданне аб нацыянальнай супольнасці і аб сябе, як яе прадстаўніку; 2) эмацыйна-ацэначны – нацыянальная самапавага або грэбаванне, нацыянальны гонар ці сорам і інш., 3) паводніцкі – адпаведныя дзеянні і ўчынкі, абумоўленыя двума папярэдне згаданымі кампанентамі [2, с. 180].

З улікам гэтай структуры можна сцвярджаць наступнае:

1) пра сябе беларусы ведалі вельмі мала, тым не менш, гэтае веданне патроху пачало прырастаць – прынамсі, беларусы ўжо ўсведамлялі сябе беларусамі, а не «тутэйшымі», чыё этнічнае аблічча было нявызначаным;

2) выразнае ўсведамленне беларусамі свайго невысокага культурнага ўзроўню, адсутнасць «маякоў» у постацях прадстаўнікоў уласнай нацыянальнай эліты і многае іншае параджалі ў іх асяроддзі комплекс этнічнай непаўнацэннасці, якая выяўлялася пры апрабаванні яе, у прыватнасці, польскай «лакмусавай паперкай»;

3) вобраза- і стэрэатыпатворчыя намаганні беларусаў былі накіраваны на ўнясенне ў стэрэатып паляка элементаў, якія аддалялі яго ад польскага аўтастэрэатыпа, на якім ён будаваўся першапачаткова, і спрыялі яго

негатывізацыі.

Што ж з'яўлялася эмацыйна-псіхалагічнай асновай дадзенага стэрэатыпа? Пра гэта вельмі выразна сказаў Я. Купала ў сваім вершы «А хто там ідзе?». Рухала імі – «пагарджанымі, сляпымі і глухімі» – крыўда і жаданне «называцца людзьмі» [10].

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Ольшанский, Д.* Основы политической психологии / Д. Ольшанский. – Екатеринбург: Деловая книга, 2001. – 496 с.
2. *Айтбаев, А. А.* Феномен национального менталитета / А. А. Айтабаев // Актуальные проблемы гуманитарных и естественных наук. – 2016. – № 7–2. – С. 180–183.
3. *Bardach, J.* Wieloszczeblowa świadomość narodowa na ziemiach litewsko-ruskich Rzeczypospolitej w XVII–XX / J. Bardach / Krajowość – tradycje zgody narodów w dobie nacjonaliymu. – Poznań: Instytut Historii UAM, 1999. – S. 11–34 / Odbitka z zbióru: Materiały z międzynarodowej konferencji naukowej w Instytucie Historii UAM w Poznaniu (11–12 maja 1998).
4. Прамова Мялешкі // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; Падрыхтаваў А. І. Богдан [і інш.] / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 674–677.
5. *Сержпутоўскі, А. К.* Дваранін // Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1999. – С. 148–149.
6. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Пінская шляхта / В. Дунін-Марцінкевіч // Выбраныя творы. – Мінск: Дзяржаўнае вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1957. – С. 48–68.
7. *Хатеев, Алексий свящ.* Полоцкий собор 1839 года / свящ. Алексий Хатеев // Сайт прихода иноны Всей скорбящих Радость – Режим доступа: http://www.sobor.by/sobor1839.php. – Дата доступа: 24.01.2019.
8. *Кротов, А. М.* Реакция белорусского обывателя на польское национально-освободительное движение на белорусских землях в XIX веке / А. М. Кротов // Беларусь у XIX–XXI стагоддзях: праблемы этнакультурнага і нацыянальна-дзяржаўнага развіцця: зб. навук. арт. / ГДУ імя Ф.Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – С. 17–26.
9. *Чернявская, Ю.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. Чернявская. – Минск: ФУАинформ, 2010. – 512 с.
10. *Купала, Я.* А хто там ідзе? / Я. Купала // Вершы беларускіх паэтаў. Нацыянальны паэтычны партал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vershy.ru/content/khto-tam-idze. – Дата доступу: 29.01.2019.


**(Дата падачы: 6.02.2019 г.)**

*С. В. Кузьміч*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*S. Kuzmich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 93/94**

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ АТРЫМАННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ (1991–1996 ГГ.)